**Водзыў**
**на аўтарэферат кандыдацкай дысертацыі К. Р. Пышкала**
**«Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі**
**(1772–1861 гг.)»**

Несумненнай з'яўляецца актуальнасць тэмы дысертацыі. Запатрабаванасць сацыяльнай праблематыкі ў сучаснай гістарычнай навуцы вызначаецца неабходнасцю, па-першае, вывучэння тых аспектаў жыцця грамадства, якія раней не разглядаліся даследчыкамі, па-другое, выкарыстання сучаснай метадалогіі і новых фактaлагічных дадзеных у межах так ці інакш даследаваных пытанняў. Дысертацыя К. Р. Пышкала адпавядае першаму з гэтых напрамкаў і ўздымае тэму, якая не вывучалася ў айчыннай гістарыяграфіі, – саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Навуковая значнасць выбранай тэмы абумоўлена як адсутнасцю адпаведных комплексных даследаванняў праблемы, так і магчымасцю ацаніць, як на апеку, маёмаснае і прававое становішча дзяцей-сірот у кожным саслоўі ўплывалі гістарычны кантэкст, тэндэнцыі ў развіцці грамадства, а таксама дзяржаўная палітыка. У сваю чаргу, на падставе аналізу апекі над дзецьмі-сіротамі выяўляецца эвалюцыя інстытута дзяржаўнай абароны насельніцтва, інстытута сям'і, розніца ў прававым і фактычным становішчы саслоўяў.

Храналогія даследавання ахоплівае працяглы і дастаткова складаны для даследчыка перыяд – уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі і адаптацыі грамадства да новай палітычнай і сацыяльна-прававой рэальнасці. Пытанні сацыяльнай гісторыі канца XVIII – першай паловы XIX ст. у айчыннай гістарыяграфіі вывучаны слабей у параўнанні з пазнейшым паслярэформенным перыядам Расійскай імперыі, што адлюстравана ў гістарыяграфічным аналізе аўтарэферата. Тым больш каштоўным з'яўляецца тое, што саіскальнік прыводзіць новыя для беларускай гістарычнай навукі фактaлагічныя дадзеныя, уводзіць у навуковы ўжытак вялікую колькасць дакументальных матэрыялаў. На падставе прыведзеных у аўтарэфераце пераліку выкарыстаных архіўных фондаў і зробленых у дысертацыі высноў можна адзначыць, што К. Р. Пышкала ў дастатковай меры ахапіла ў даследаванні ўсе пяць губерняў на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь: Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Мінскую і Магілёўскую. Прыцягнутыя да даследавання дадзеныя з фондаў розных архіваў дазволілі аўтару нават вылучыць пэўную спецыфіку ў арганізацыі апекі над сіротамі дваранскага саслоўя ў розных губернях. У той час як у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях ужо з канца XVIII ст. заснаўваліся спецыялізаваныя органы – дваранскія апекі, то ў Гродзенскай і Віленскай

гэты працэс ішоў павольней, і на першапачатковым этапе апека рэгулявалася Галоўным судом. Трэба таксама адзначыць, што ў працэсе даследавання былі выкарыстаны матэрыялы не толькі архіваў Рэспублікі Беларусь, але і фонды Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (Санкт-Пецярбург). Акрамя таго, разнастайнасць крыніц: заканадаўчыя, справаводчыя, матэрыялы перыядычнага друку – узмацнілі абгрунтаванасць высноў, зробленых у выніку праведзенага даследавання, а іх сукупнасць з'яўляецца ў дастатковай меры рэлевантнай і валодае высокай ступенню інфарматыўнасці.

Асобнай увагі заслугоўвае вылучаная аўтарам спецыфіка апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. у розных саслоўях. Адзначана, што спецыяльныя саслоўныя інстытуты, пад якімі ў працы разумеюцца ўстановы, функцыянавалі толькі для двух саслоўяў – дваранства і гарадскіх абывацеляў. Іх першачарговай задачай было захаванне маёмасці сіраты, а клопат аб дзіцяці, яго адукацыя і выхаванне знаходзіліся на другім плане. Аўтар адзначае падобныя ў дзейнасці двух гэтых інстытутаў паслядоўнасць працы, механізмы прызначэння апекуноў і ўзаемадзеянні з імі. У двух іншых саслоўях – духавенства і сельскія абывацелі – у дадзены перыяд цэласных інстытутаў апекі не склалася. Таму абгрунтавана выглядае структура дысертацыі, якая прадугледжвае разгляд формаў апекі над сіротамі ў гэтых двух саслоўях у рамках агульнай главы ў якасці яе раздзелаў. У саслоўі духавенства К. Р. Пышкала галоўнай рысай апекі над сіротамі называе яе карпаратыўнасць, а ў саслоўі сельскіх абывацеляў дыферэнцыруе практыкі апекі ў залежнасці ад катэгорыі сялян.

На падставе вывучанага аўтарэферата можна заключыць, што кандыдацкая дысертацыя Кацярыны Рыгораўны Пышкала адпавядае асноўным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да такога роду прац, з'яўляецца грунтоўным і завершаным комплексным навуковым даследаваннем, а яго аўтар валодае ўсімі неабходнымі кампетэнцыямі даследчыка і заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук. Выказваю згоду на размяшчэнне водгуку на сайце ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі».

Водзыў разгледжаны і зацверджаны на кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт” 27.02.2026 г., пратакол № 8.

Загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных
дысцыплін УА “Беларускі дзяржаўны
аграрны тэхнічны ўніверсітэт”,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Я. А. Грэбень

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ МИНСК УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АГРАРНЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»